9. Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн, 2004. – 448 с.

10. Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 1. А – Л / І. Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. – 672 с.

11. Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 2. М – Я / І. Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. – 704 с.

12. Янкоўскі, Ф. М. Беларуская фразеалогія / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск : Нар. асвета, 1981.

13. Янкоўскі, Ф. М. Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск : Выш. шк., 1968. – 449 с.

14. Ставская, Г. М. Учусь понимать образные выражения: фразеологический словарик : пособие / Г. М. Ставская. – М. : Дрофа, 2002. – 224 с.

15. Львов, М. Р. Речь младших школьников и пути ее развития : пособие / М. Р. Львов. – М. : Просвещение, 1975. – 176 с.

16. Выгонная, Л. Ц. Фанетыка беларускай мовы ў школе / Л. Ц. Выгонная. – Мінск, 1995.

17. Маслова, В. А. Лингвокультурология / В. А. Маслова. – М. : Академия, 2001. – 208 с.

**Г.М. Канцавая[1], С.К. Патапчук[2]**
[1]Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»
[2]Брэст, ДУА «ВПК дзіцячы сад – пачатковая школа № 5 г. Брэста»

## ПРАЦА З РОЗНЫМІ ВІДАМІ ТЭКСТАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ЧЫТАЦКАЙ ГРАМАТНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

У даследаваннях PISA «чытацкая граматнасць – здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць над імі і займацца чытаннем для таго, каб дасягаць сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці» [1].

Авалоданне зместам курса беларускай мовы – найважнейшая ўмова агульнай паспяховасці навучання малодшых школьнікаў. Інфармацыйна-змястоўныя, інструктыўныя, даведачныя тэксты, якія актыўна выкарыстоўваюцца на ўроках беларускай мовы, з'яўляюцца сродкам фарміравання чытацкай граматнасці малодшых школьнікаў. Кожны з пералічаных відаў тэкстаў патрабуе пэўнай спецыфікі працы.

*Інфармацыйны-змястоўны тэкст* змяшчае асноўную інфармацыю аб вывучаемым аб'екце: назва, характарыстыка, спецыфіка і інш. Адна з мэт гэтага віду тэксту – падача змястоўнай інфармацыі, аднак не меншае

значэнне мае гэты від тэксту і для ўзбагачэння чытацкага вопыту вучняў пачатковых класаў. Галоўнай умовай рэалізацыі гэтага патэнцыялу з’яўляецца правільная арганізацыя працы з гэтымі тэкстамі, а не ўзнаўленне настаўнікам ведаў, якія змяшчаюцца ў тэкстах. Відам інфармацыйна-змястоўнага тэксту ў падручніках па беларускай мове з’яўляецца выклад лінгвістычнай інфармацыі, моўнага закона, які ў падручніку адлюстраваны як рубрыка «Правіла» [2]. У такіх тэкстах змяшчаецца палажэнне, якое выражае пэўную заканамернасць, указанне на суадносіны паміж якімі-небудзь з’явамі.

Ключавым момантам працы малодшага школьніка з гэтымі тэкстамі з’яўляецца такая арганізацыя працы, якая забяспечыць разуменне лінгвістычнай інфармацыі, што прысутнічае ў правіле, а не механічнае яе запамінанне. Улічваючы аб’ектыўную цяжкасць разумення малодшымі школьнікамі навуковай інфармацыі, сфармуляванай вельмі лаканічна, настаўнік павінен рыхтаваць вучняў да яе ўспрымання. Гэтаму садзейнічаюць наступныя метадычныя прыёмы:

1) арганізацыя да ўвядзення правіла назірання над моўным матэрыялам з мэтай выяўлення пэўнай заканамернасці;

2) фармуляванне вывадаў-абагульненняў праведзенага назірання;

3) чытанне правіла з мэтай суаднясення інфармацыі, выкладзенай у ім, са зробленымі вучнямі самастойна вывадамі.

Захаванне такой паслядоўнасці працы прыводзіць да таго, што складаная мова правіла не выклікае цяжкасцяў. Уключэнне ў падручнікі рубрык «Правіла», «Праблемнае пытанне» [2] дазваляе арганізаваць падрыхтоўку да ўвядзення тэкстаў, якія ўказваюць на моўныя заканамернасці. У лінгвістычнай інфармацыі, акрамя фармулявання закона мовы, прыводзяцца прыклады, таму настаўнік павінен пастаянна звяртаць увагу вучняў на тое, што фармулёўка закона нязменная, а прыклады могуць быць зменены.

Пры чытанні тэксту, які змяшчае інфармацыю пра моўныя заканамернасці, можна выкарыстоўваць прыём падкрэслівання ключавых слоў. Мае значэнне і сістэма пытанняў, на якія прапануе адказаць настаўнік пасля знаёмства з правілам. Гэтыя пытанні накіраваны на праверку разумення інфармацыі, якая змяшчаецца ў правіле. Пасля таго як настаўнік упэўніцца ў тым, што кожны вучань прачытаў і зразумеў правіла, вылучыў у ім фармуляванне заканамернасці і прыведзеныя прыклады, мэтазгодна прапанаваць вучням пераказаць правіла.

Асаблівае значэнне мае складанне на аснове правіла розных схем, мадэляў. Праца над схемай правіла павінна займаць значнае месца ў навучанні беларускай мове. Акрамя дакладна сфармуляваных правіл, у падручніках даецца лаканічная інфармацыя тлумачальнага характару.

Гэта рубрыка «Завяжы вузялок!» [2]. Важна паказаць малодшым школьнікам асаблівасці гэтага віду тэксту: у адрозненне ад правіл, якія з’яўляюцца кіраўніцтвам да наступнага дзеяння, гэтыя тэксты змяшчаюць інфармацыю ўдакладняльнага характару, у іх ёсць указанне на асаблівасці функцыянавання правіла, яго выкарыстання.

Настаўніку неабходна навучыць малодшых школьнікау суадносіць інфармацыю, выражаную вербальна, з інфармацыяй, выражанай іншымі спосабамі, напрыклад у схеме, табліцы. Часта інфармацыя, якая падаецца наглядна, дубліруе славесную інфармацыю, таму настаўніку неабходна дапамагчы вучням убачыць гэта: суаднесці адну і тую ж інфармацыю, выражаную рознымі спосабамі.

Асобым відам інфармацыйна-змястоўнага тэксту з’яўляюцца змешчаныя ў падручніку табліцы. Вельмі важна навучыць малодшых школьнікаў пры працы са схемамі або табліцамі граматна іх «чытаць»: бачыць графічную структуру, разумець пабудову граф, слупкоў, прызначэнне стрэлак, прасочваць суадносіны тэкставай і графічнай інфармацыі.

Яшчэ адным відам інфармацыйна-змястоўнага тэксту з’яўляецца інфармацыя, накіраваная на пашырэнне эрудуцыі вучняў, якая ў падручніку змяшчаецца ў рубрыцы «Інфармацыя пра мову і маўленне» [3]. Малодшаму школьніку трэба дапамагчы зразумець, што гэтая інфармацыя не з’яўляецца абавязковай для запамінання, але дапамагае лепш зразумець асноўны матэрыял урока.

Да інфармацыйна-змястоўных адносяцца таксама тэксты, на аснове якіх будуюцца практыкаванні. У такіх тэкстах не выкладаецца інфармацыя, а даюцца асновы для рашэння пэўнай вучэбнай задачы. Для сучасных падручнікаў беларускай мовы ўласціва пабудова практыкаваняў на тэкставай аснове. Мэтай працы з такімі тэкстамі з’яўляецца пошук патрэбных моўных адзінак, назіранне за іх функцыянаваннем у тэксце. Метадычныя прыёмы, якія садзейнічаюць развіццю чытацкай граматнасці пры працы з гэтымі відамі тэкстаў, накіраваны на тое, каб вучні перад чытаннем тэксту разумелі пастаўленую ў практыкаванні задачу і чыталі тэкст менавіта з пункту погляду рашэння гэтай задачы.

Фармулёўка задання да практыкаванняў – гэта адзін з відаў *інструктыўнага тэксту* ў падручніках беларускай мовы. Пры працы з такімі тэкстамі вельмі важна выкарыстоўваць спецыяльныя метадычныя прыёмы: аналіз, тлумачэнне, вучэбны дыялог, якія дазволяць забяспечыць разуменне фармулёвак заданняў. Настаўніку трэба дапамагчы вучням зразумець сэнс прапанаванай у падручніку фармулёўкі, а не самому даваць спрошчаную фармулёўку задання.

Асаблівае месца сярод інструктыўных тэкстаў займаюць алгарытмы выкарыстання правіл [2]. Іх уключэнне ў падручнік і навучанне рабоце з

імі мае прынцыповае значэнне, так як для малодшых школьнікаў моўны закон, які змешчаны ў правіле, не з’яўляецца кіраўніцтвам да дзеяння. Прамежкавым звяном паміж засваеннем правіла і яго выкарыстаннем з’яўляецца праца з алгарытмамі. Арганізацыя дзейнасці малодшых школьнікаў па выкарыстанні алгарытмаў уключае некалькі этапаў: удзел у калектыўным канструяванні алгарытму, агучванне алгарытму і пакрокавае яго выкарыстанне, візуалізацыя ў працэсе самастойнага выкарыстання.

*Даведачны тэкст* змяшчае кароткія звесткі, якія ўдакладняюць характарыстыку вучэбнага аб’екта. Настаўніку неабходна самому дакладна разумець, што такое даведачны тэкст і ў чым заключаюцца асаблівасці методыкі фарміравання ў малодшых школьнікаў умення працаваць з даведачным тэкстам на ўроках у пачатковай школе. Да даведачных тэкстаў адносяцца слоўнікавыя артыкулы, featurezнага характару паказальнікі, падказкі, заўвагі. На этапе працы, калі правіла ці паняцце ўжо засвоена, мэтазгодна звярнуць увагу вучняў на даведачны тэкст, даць удакладняльныя сціслыя звесткі пра пра раней вывучанае правіла, паняцце, вывад, алгарытм, уласцівасць. Вучняў неабходна пазнаёміць з прынцыпамі пабудовы даведачных тэкстаў. Структура даведачнага тэксту адрозніваецца ад іншых відаў вучэбных тэкстаў перш за ўсё тым, што яго змест у цэлым можа быць вучням вядомы, зразумелы, аднак гэты знаёмы матэрыял патрабуе ўдакладнення, тлумачэння.

Для даведачных тэкстаў характэрны ўласцівасці, з якімі настаўнік павінен пазнаёміць вучняў як мага раней. Пры працы з даведачнымі тэкстамі ад вучняў патрабуецца добрае веданне алфавіта для таго, каб хутка знаходзіць патрэбную інфармацыю. Малодшыя школьнікі павінны ўмець выбраць эфектыўны шлях для пошуку даведачнай інфармацыі, вучыцца самастойна складаць некаторыя даведачныя тэксты, напрыклад даваць разгорнутае тлумачэнне слова. Неабходна падкрэсліць асаблівую ролю даведачнага тэксту ў азнаямленні з любым вывучаемым матэрыялам: удакладненне значэння паняцця (тэрміна), сістэматызацыя атрыманых ведаў, пашырэнне аб’ёму ведаў пра аб’ект і г. д.

Пералічаныя асаблівасці даведачных тэкстаў надзвычай важныя для паспяховай працы малодшых школьнікаў. Веданне алфавіта дапаможа зарыентавацца ў лінгвістычных слоўніках, даведніках, энцыклапедыях, каталогах і г. д. Пошук эфектыўнага шляху ў знаходжанні даведачнай інфармацыі неабходны для хуткага ўдакладнення ці вырашэння пытання, якое ўзнікла ў працэсе вывучэння матэрыялу. Для таго каб паспяхова працаваць з даведачнай інфармацыяй, неабходна вучыць малодшых школьнікаў чытаць і разумець такія тэксты, як слоўнікавы артыкул, асаблівасць якога заключаецца ў засваенні дакладнай, сціслай інфармацыі. Калі

вучні працуюць са слоўнікам, то ім неабходна ведаць структуру слоўніка, асаблівасці слоўнікавага артыкула, прызначэнне паказальнікаў і памет.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на актывізацыю працы вучняў з даведачным дадаткам да падручніка. У яго ўваходзяць і слоўнікі, і памяткі, і табліцы, неабходныя для выканання заданняў, прапанаваных у падручніку. У такіх матэрыялах вучні павінны ўмець хутка і дакладна арыентавацца: ведаць, дзе знаходзяцца слоўнічкі ці іншыя матэрыялы, умець знайсці патрэбнае слова ці табліцу, правільна «прачытаць» іх, прааналізаваць, выбраць істотнае і атрыманую інфармацыю выкарыстаць для выканання канкрэтнага задання.

Такім чынам, праца малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы з інфармацыйна-змястоўнымі, інструктыўнымі і даведачнымі тэкстамі з’яўляецца сродкам фарміравання чытацкай граматнасці вучняў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Цукерман, Г. А. Победа в PIRLS и поражение в PISA: судьба читательской грамотности 10–15-летних школьников / Г. А. Цукерман, Г. С. Ковалева, М. И. Кузнецова // Вопр. образования. – 2011. – № 2. – С. 123–150.

2. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 1. – 144 с.

3. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : падруч. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 2. – 128 с.